**УЛАДЗІСЛАЎ ГАРБАЦКІ**

# Беларусь згубіла паліталягіню



Чалавекам, які заўсёды падбадзёрваў, вось кім была спадарыня Сьвятлана. Зь першых хвілінаў майго знаёмства зь ёю на франка-беларускім факультэце, г.зн. яшчэ ў студэнцкія гады, у гэтак званую «залатую пару» ЭГУ ў Менску (канец 1990-х гадоў), яна падбадзёрвала нас, студэнтаў, якія складалі іспыт для акрэдытацыі ўнівэрсытэту. Яна ня кідала студэнтаў у халодны і абстрактны вір паліталёгіі, а заўсёды вельмі жыва, без усякай адцягнутасьці апавядала аб палітыцы, спакваля ўводзячы нас у палітычную навуку. Дзякуючы ёй я зразумеў, што палітычная навука — гэта тое, што цалкам магчыма ахапіць. Дзякуючы ёй гэтая дысцыпліна не палохала, не адштурхоўвала ад сябе студэнтаў.

Пасьля францускіх выкладнікаў палітычнай навукі манэра выкладаньня Сьвятланы Навумавай не зьдзіўляла, а разумелася як працяг францускай. А гэта прытым, што спадарыня Навумава належала хутчэй да савецкай традыцыі паліталёгіі. Мяне вабіла тое, што спадарыня Сьвятлана была цьвярозай паліталягіняй без усялякіх рэзкіх і наіўных закідонаў у нацыянальнае і нацыяналістычнае. Гэткая халодная і ўнівэрсалісцкая навукоўка, якая не дазваляла сабе верыць і тым больш шырыць балачкі і міты пра беларусаў. Канечне, яна была дзіцем свайго пакаленьня: савецкага і расейскамоўнага. Тым не менш, яна цалкам была ў строме часу, у строме нашых, беларускіх

**Уладзіслаў Гарбацкі** — культуроляг, магістар палітычных навук, выкладчык Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.

турботаў. Проста як унівэрсалістка і касмапалітка яна трапна даводзіла, што акрамя сымбаляў патрэбны перадусім рацыянальныя праграмы і разуменьне рэчаіснасьці. У гутарках, на лекцыях, у інтэрвію яна сьцьвярджала аб шкоднасьці нацыянальнай настальгіі, на якую часта хварэе наша апазыцыя. Яна пісала аб тым, што ня варта заставацца ў «дзяцінстве нацыі» і культаваць гарапашны вобраз беларуса, неабходна сягаць сьмела ў новую эпоху. Яна выказвалася ня толькі супраць настальгіі апазыцыі, але і супраць жудаснага савецкага пасэізму Лукашэнкі. Ёй належыць цудоўны вырак: «Гэты чалавек сёе-тое зрабіў для мінулага, але ў мінулым жа і застаўся».

Сьвятлана Навумава выказвалася супраць жудаснай савецкай харызмы Лукашэнкі.

Так, яна заўжды імкнулася да сучаснага. Дзякуючы працы з маладымі, яна разумела праблемы маладой Беларусі, а часам яна была куды сучасьнейшай і крытычнейшай за саміх маладых. З аднаго боку, яна ахалоджвала некаторых рамантычна беларусаў сваім стрыманым шанаваньнем беларускай мовы, бел-чырвона-белага сьцягу і цьверджаньнямі кшталту «беларуская нацыя — ня надта амбітная» ў мінулым. З другога боку, яна слушна даводзіла, што на сучасным этапе беларусы маюць амбітныя праекты, а галоўнае здольнасьці іх ажыцьцявіць. Ейны ўдзел у кампаніі «Гавары праўду» — якраз доказ ейнай уласнай заангажаванасьці і інтэлектуальнай амбітнасьці.

Спадарыня Сьвятлана хоць і супрацоўнічала з пэўнымі рухамі і ўнівэрсытэтамі, тым ня менш, заставалася вальнадумкай, сьмелай і адкрытай інтэрпрэтаркай рэчаіснасьці, перадусім палітычнай. Як сапраўдная крытычная інтэлектуалка яна ніколі не дазваляла сабе агучваць чужыя і тым больш заідэалягізаваныя думкі.

Вядома, што некаторыя студэнты, а таксама маладыя палітолягі малявалі яе гэткай савецкай прафэсаркай, кпілі зь ейных унівэрсалізму, касмапалітызму і малой зацікаўленасьці этнічнай беларускай тэмай. Але яна сьмела адсякала повязі з тым, што хутчэй шкодзіла разьвіцьцю сучаснага беларускага мысьленьня — з празьмерным пасэізмам і фаталізмам беларусаў.

Яна не засяроджвалася на вузкіх тэмах мінуўшчыны, а цалкам скіроўвалася ў будучыню. Яна шукала, выхоўвала, апраўдвала палітыкаў з сучасным мысьленьнем. На жаль, як яна канстатавала, такіх у нас мала, нават у колах апазыцыі. Яе аналітычны розум базаваўся як на грунтоўных ведах, так і на жывой цікаўнасьці сучаснасьцю. Яна пільна сачыла за тым, што дзеялася ў нас, а таксама ў пэўнай ступені роднай ёй Літве. Яна са смакам чытала беларускія, літоўскія, расейскія кнігі, а таму лепей бачыла нашы ўласныя хібы і здабыткі. Часта ёй прыпісвалі моўную антыбеларускасьць, тым часам як яна з ахвотаю чытала беларускамоўныя кніжкі і не аднойчы пазначала штучнасьць моўнага канфлікту ўнутры грамадзянскай супольнасьці. Як хораша яна выказвалася аб прыгажосьці беларускай мовы; а на крытыку ў свой адрас адказвала, што выкладнікі паліталёгіі не падзяляюцца на беларускамоўных і расейскамоўных, а на добрых і дрэнных, разумных і ня вельмі.

Цяпер надышоў час нам гаварыць праўду пра яе, надышоў час нам падбадзёрыць яе родных, як уперад рабіла сама спадарыня Сьвятлана са сваім студэнтамі або калегамі. Калі родныя згубілі маму ці цёцю, то краіна згубіла мужную кабету, волатку ўнівэрсалізму, навукоўку, якая не разважала катэгорыямі асобнага, партыкулярнага, вузкага. Яна бачыла сьвет і, Беларусь у прыватнасьці, глябальна, у зьвязцы з Эўропай, праз прызму хібаў і дасягненьняў як уладаў, так і апазыцыі.

Краіна згубіла адну зь нешматлікіх паліталягінь, якую нясорамна было так называць у краіне, дзе званьне палітоляга звычайна носяць дзясяткі ці нават сотні асобаў на службе ў рэжыму.